Нікітік В.А.,  Кадраў С.В., студ. гр. 115 ФТБК і СМ
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Алексніна І.А.,
канд. мастацтвазнаўства, дацэнт

# РОЛЯ ЦЭНТРА БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ І РЭЖЫСУРЫ Ў СУЧАСНЫМ ТЭАТРАЛЬНЫМ МАСТАЦТВЕ БЕЛАРУСІ

**Цэнтр беларускай драматургіі і рэжысуры** быў створаны ў сакавіку 2007 года. Галоўная мэта Цэнтра – пошук і падтрымка маладых драматургаў і рэжысёраў, збіранне і распаўсюджанне лепшых узораў беларускай сучаснай драматургіі, іх шырокая прапаганда разнастайнымі формамі сцэнічнага мастацтва.

Падобнае структурнае фарміраванне пад назвай “Цэнтр па захаванню, прапагандзе і прадстаўленню дзеячам тэатральнага мастацтва новых п'ес беларускіх аўтараў”, пачало сваё існаванне ў адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі на базе Беларускага саюза тэатральных дзеячаў. Але яго фарміраванне не было завершана па прычыне адсутнасці адпаведнай штатнай колькасці і матэрыяльна-тэхнічнай базы. Перадача Цэнтра пад дах Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры (даручэнне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 13.06.2003 № 10/206-49П2414) таксама не прынесла поспеху задуманай справе з прычыны вызначанай для яго Інстытутам праблем культуры штатнай колькасці ў 2,5 адзінкі і практычна не прадстаўленай для работы неабходнай матэрыяльнай базы, што можа на далейшае стаць перасцярогай для ўсіх зацікаўленых у існаванні Цэнтра асоб і арганізацый.

На сённяшні дзень ў штаце Цэнтра налічваецца 10 адзінак (рэжысёры, рэдактары, мастакі і г.д.), пачалася работа па стварэнні адпаведнай матэрыяльна-тэхнічнай базы.

Сёння ў межах дзейнасці Цэнтра драматургіі і рэжысуры праводзяцца чыткі новых беларускіх і замежных п'ес, драматургічныя on-line праекты, паказ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эксперыментальных рэжысёрскіх работ, драматургічныя лабараторыі з удзелам замежных драматургаў і крытыкаў, відэапрагляд спектакляў, круглыя сталы з удзелам крытыкаў, журналістаў, драматургаў, рэжысёраў. Маладыя драматургі і рэжысёры падчас працы ў Цэнтры маюць магчымасць стварыць сумесныя праекты і прадставіць іх шырокай аўдыторыі.

Такім чынам, Цэнтр прызваны да актыўнай працы з творчай моладдзю і да прапаганды новых форм у тэатральным мастацтве. Ён практычна з'яўляецца адзінай у сталіцы Беларусі эксперыментальнай творчай сцэнічнай пляцоўкай, дзе можа рэалізаваць свой мастацка-творчы патэнцыял кожны малады драматург, рэжысёр, сцэнограф, кампазітар, альбо ў сістэме семінараў, канферэнцый, майстар-класаў набыць новыя прафесійныя веды.

У рамках мерапрыемстваў, арганізаваных і праведзеных Цэнтрам за час яго дзейнасці, шырокай аўдыторыі было прадстаўлена творчасць больш за 10 новых беларускіх аўтараў. Сярод іх Віктар Красоўскі, Марына Доўгар, Андрэй Бібікаў, Канстанцін Сцешык, Павел Расолька, Дзмітрый Багаслаўскі, Вольга Гапеева, Таццяна Ламонава, Марыя Савельева, Любоў Новікава.

Акрамя таго ў Цэнтры дэбютавалі пачынаючыя рэжысёры: Сяргей Анцэлевіч, які цяпер працуе ў штаце Цэнтра; Святлана Івашкевіч (майстэрня Валерыя Раеўскага Акадэміі мастацтваў); Дзяніс Фёдараў і Антон Кудрэвіч (майстэрня Рыгора Баравіка); Святлана Рошчына, Таццяна Ачапоўская і Вера Кананенка (майстэрня Аляксандра Гарцуева); Аляксандр Марчанка (майстэрня Валерыя Анісенкі) і Васіль Дранько-Майсюк (майстэрня Рыда Таліпава).

Спектакль "Сталіца Эраўнд", пастаўлены ў Цэнтры ў 2007 годзе, дэбют драматурга Сяргея Гіргеля і рэжысёра Вольгі Саратокінай, удзельнік Міжнародных фестываляў, у тым ліку і І Міжнароднага фестываля новай еўрапейскай п'есы ў Вюсбадэне (2008 г.), дзе атрымаў высокую адзнаку крытыкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 2008 годзе Цэнтр (сумесна з Польскім Інстытутам у Мінску) выдаў зборнік "Сучасная польская і беларуская п'еса" і сцэнічна прэзентаваў творы беларускіх і польскіх аўтараў.

У лістападзе 2008 года Цэнтр правёў семінар сучаснай беларускай драматургіі з удзелам Паўла Руднева (арт-дырэктар Цэнтра імя Мейерхольда, тэатральны крытык) і Міхаіла Дурнянкова (расійскі драматург, пераможца Міжнароднага драматургічнага конкурсу "ЕўраАзія-2008"). У семінары прымалі ўдзел маладыя беларускія аўтары (М.Савельева, Д.Каханьскі, В.Прашковіч і інш.), некаторыя з якіх упершыню пабачылі свае творы на сцэне. Навучальны семінар, дзе прафесійна абмяркоўваліся вартасці і недахопы п'ес, меў працяг – па некаторым п'есам, прадстаўленым на ім, адбыліся прэм'еры на эксперыментальнай сцэне Цэнтра ("Хлам" Міхаіла Дурнянкова, "Untitle" Паўла Расолькі).

Праца Цэнтра спрыяе развіццю маладой беларускай драматургіі, якая знаходзіцца зараз у даволі непростым становішчы і якой, безумоўна, неабходна падтрымка. За 2 гады працы ў Цэнтры склаліся творчыя тандэмы "драматург-рэжысёр", якія ў 2009 годзе прадставілі шэраг прэм'ер. Гэта: "Мае рукі" (драматург Дзмітрый Багаслаўскі, рэжысёр Сяргей Анцэлевіч), "За Кратамі" (драматург Марына Шімчык, рэжысёр Наталля Мельнікава), аўтарскія праекты Мікалая Рудкоўскага "Сляпая зорка" і Андрэя Бібікава "Яма".

Спектаклі па творах маладых беларускіх аўтараў у супрацоўніцтве з маладымі рэжысёрамі, створаныя Цэнтрам, вызначаюцца актуальнасцю, сучаснасцю праблематыкі, пошукам эксперыментальных формаў у галіне тэатральнага мастацтва.

Такім чынам, небезпадстаўна можна сцвярджаць, што дзейнасць Цэнтра беларускай драматургіі і рэжысуры адыгравае ў сучасным тэатральным мастацтве Беларусі дастаткова значную ролю, таму што спрыяе адкрыццю імён маладых беларускіх драматургаў і дае магчымасць (за кошт супрацоўніцтва з маладымі беларускімі рэжысёрамі) убачыць свае пьесы на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сцэне, прыняць удзел у шэрагу творчых семінараў, канферэнцый, майстар-класаў, набыць новыя прафесійныя веды.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ